***Лявіцкі, А.М.***
*студэнт 3 курса*
*Навуковы кіраўнік: С.М. Цемушаў*

# ІНТЭЛЕКТУАЛЫ І ЎЛАДА Ў БССР (1980-Я ГАДЫ): ГІСТАРЫЯГРАФІЯ ПРАБЛЕМЫ

Актуальнасць праблематыкі ўзаемаадносін улады і інтэлектуалаў у савецкі перыяд абумоўлена некалькімі фактарамі, і агульная канстатацыя нераспрацаванасці тэмы будзе відавочна недастатковай. Праблема "ўлада–інтэлектуалы" натуральным чынам вылучаецца на першы план у рамках рэфлексіі над складаным працэсам станаўлення грамадзянскай супольнасці ў Беларусі і на абшары колішняга СССР пасля 1985 г. і асабліва 1991 г. У Беларусі, аднак, у перыяд 1991–1995 гг. савецкая праблематыка не знайшла шырокага адлюстравання ў даследаваннях, бо на парадку дня стаялі іншыя пытанні. Радыкальная змена грамадска-палітычнай і культурнай сітуацыі (ці, дакладней, палітыкі дзяржавы адносна культуры) у сярэдзіне 1990-х гг. некалькі нечакана спрычыніліся да актуалізацыі пытанняў савецкай гісторыі наогул, гісторыі інтэлектуалаў і гісторыі дысідэнцтва ў прыватнасці [1, с. 21].

1980-я гг. – час, адзначаны шэрагам унікальных асаблівасцяў. Адным з сімвалаў найноўшай гісторыі з'яўляецца распачатая ў 1985 г. перабудова, якая ў далейшым прывяла да ліквідацыі Савецкага Саюзу, дэмантажу савецкай грамадска-палітычнай і сацыяльна-эканамічнай сістэм. Аднак "водар свабоды", які дзякуючы М. Гарбачову знайшоў выразнае ўвасабленне ў штодзённай рэчаіснасці, быў адчувальны і да 1985 г.: "Свабода самавыяўленьня … пашыралася й на літаратуру, музыку, кіно" [2, с. 6]. Адной з важкіх прычын такіх настрояў, як можна меркаваць, было паступовае аслабленне самой сістэмы ўлады – прынамсі ў дачыненні да сферы культуры. В. Ерафееў зазначаў: "Разгром "МетрОполя" (1979 г. – Л.А.), з аднаго боку, пік, кульмінацыя застою; з іншага – усё ўжо было на зыходзе" [3, с. 10]. На асаблівыя абставіны на мяжы 1970–1980-х гг. звяртае ўвагу таксама і С. Дубавец [4, с. 42].

Перш за ўсё, варта спыніцца на пытанні тэрміналогіі. Справа ў тым, што катэгорыя "інтэлектуалы" яшчэ не знайшла прызнання ў беларускай гуманістыцы, а традыцыйны тэрмін "інтэлігенцыя" ўяўляецца залішне абцяжараным разнастайнымі канатацыямі і сэнсамі, непажаданымі ў рамках навукі[1]. Межы дадзенай працы не дазваляюць грунтоўна раскрыць гэтае пытанне. У якасці працоўнай гіпотэзы прымем семантычнае напаўненне гэтых катэгорый за раўназначнае, аддаючы,

зрэшты, перавагу катэгорыі “інтэлектуал” і вытворным. У гэтай сувязі, каб унікнуць непажаданых разыходжанняў, спашлемся на дэфініцыю Ж. Ле Гофа: “Так называюць тых, чыім рамяством былі мысленне і выкладанне сваіх думак” [6, с. 4], не прыняўшы, аднак, звужэння кола інтэлектуалаў да выкладчыкаў і настаўнікаў (як гэта робіць услед за вядомым французскім медыевістам таксама і А.Лаўрухін [7, с. 55–56]); усё ж “выкладанне думак” было ў ХХ ст. даступнае не толькі прафесарам універсітэтаў. Увогуле, гэта пытанне мае доўгую гісторыю[2]; як заўважае нямецкі даследчык Д. Берынг: “Што такое інтэлектуал? – ледзь не пад прымусам, задаюцца пытаннем сотні кніг і тысячы эсэ” [9, S. 5][3]. Для рускай культуры ключавым пунктам гэтых “соцень кніг і тысяч эсэ” з’яўляецца, зразумела, канцэпт “інтэлігенцыі”.

Запатрабаванасць праблематыкі гістарычных лёсаў інтэлектуалаў досыць шырокая і даўняя, аднак, нягледзячы на гэта, і сёння не выпадае прагназаваць зніжэнне ўзроўню гэтай зацікаўленасці. Яшчэ ў ХХ ст. паўстала вострая неабходнасць асэнсавання ролі і месца гэтай сацыяльнай групы ў жыцці грамадства ў цэлым, і дыхатамія “ўлада–інтэлектуалы” адразу заняла значнае месца ў даследчыцкім інтарэсе. Калі пералічваць імёны тых, хто звяртаўся да гэтай праблематыкі, то ў першы шэраг павінны ставіцца А. Грамшы, вядомы сваім агульным даследаваннем інтэлектуалаў як сацыяльнай страты [10, с. 327–345], італьянскі мысліцель Н. Боббіа [11], французскі філосаф М. Фуко [12, 13], які вылучыў сваю спецыфічную і небясспрэчную трактоўку прыроды ўлады. З іншай перспектывы – “паўстання мас” – аналізаваў лёсы інтэлектуалаў у кантэксце сацыяльных зрухаў XIX – пачатку ХХ ст. Х. Артэга-і-Гасэт [14, с. 171 – 250]. Вопыт апісання становішча інтэлектуалаў у краінах сацыялістачанага блоку ў канцы 1940-х гг. ажыццявіў у 1951 г. Ч. Мілаш (беларускі пераклад быў выдадзены ў 2000 годзе) [15]. У сучаснай беларускай гуманітарнай навуцы спробы разгледзець дыхатамію “ўлада – інтэлектуалы” прадставілі Н. Антановіч [16], шэраг выкладчыкаў гістарычнага факультэта БДУ (аналагічная праблематыка, але іншыя гістарычныя перыяды) [17, 18] і Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэта [19, 20, 21, 22]. Крыху інакш фармулюецца пытанне ў цікавай працы польскай даследчыцы Г. Глагоўскай [23].

Аналізуемая праблема з’яўляецца часткай такога кірунку гістарычных даследаванняў, як інтэлектуальная гісторыя. Яна стала адным з найбольш актуальных вымярэнняў заходнееўрапейскай гуманістыкі, з’яўляючыся полем актыўнага ўзаемадзеяння гістарычных і літаратуразнаўчых навук [24, с. 6]. У фокусе ўвагі гэтага кірунку знаходзіцца інтэлектуал і яго разнастайныя ролі як “сацыяльнай фігуры”

[25]. Істотнай праблемай для гэтага даследчыцкага кірунку з’яўляецца тэрміналагічная неаднастайнасць, уласцівая розным гуманітарным традыцыям [26, с. 17–18].Сучасная інтэлектуальная гісторыя вырасла з гісторыі ідэй А. Лаўджоя, прайшоўшы складаны шлях “сацыялізацыі”, гэта значыць, звярнуўшыся да вывучэння сацыяльных умоў і кантэкстаў бытавання паасобных ідэй, а таксама пашырыўшы поле даследавання, уключыўшы ў яго побач з “ззяючымі вяршынямі” культуру простага насельніцтва [27, с. 169]. Сёння галоўнымі рысамі гэтай субдысцыпліны з’яўляюцца арыентаванасць на вывучэнне соцыякультурных кантэкстаў інтэлектуальнай творчасці, у тым ліку не толькі прадукавання ідэй, але і іх рэцэпцыі ў розных групах грамадства [27, с. 174].

Паўнавартаснае навуковае вывучэнне гісторыі дачыненняў у сістэме “ўлада – інтэлектуалы” і беларускага дысідэнцтва магло пачацца толькі пасля 1991 г., калі былі ліквідаваны найбольш адыёзныя ідэалагічныя абмежаванні ў сферы навуковай дзейнасці. Аднак у Беларусі гэты працэс ішоў вельмі марудна, нават гісторыя дысідэнцтва не трапіла ў фокус увагі гісторыкаў. Не знайшла шырокага адлюстравання гэтая праблематыкі і на старонках гістарычных перыядычных выданняў (“Беларускі гістарычны часопіс”, які выдаецца з 1993 г., “Беларускі гістарычны агляд” – з 1994 г., і інш.). У выдадзеным Інстытутам гісторыі НАН «Нарысе гісторыі беларускай дзяржаўнасці. ХХ стагоддзе» гісторыя становішча інтэлектуалаў і іх роля ў стварэнні сучаснай беларускай дзяржавы ў канцы 1980-х – пачатку 1990-х гг. [28] таксама не асвятляюцца.

Для ўзнаўлення агульнага кантэксту гістарычнага развіцця складаюць істотную вартасць абагульняючыя выданні па гісторыі Беларусі. Іх існуе даволі шмат. Найбольшым дасягненнем у гэтым кірунку даследаванняў з’яўляецца 6-ы том акадэмічнай «Гісторыі Беларусі», які выйшаў з друку ў 2011 г. (гл. напрыклад раздзел, прысвечаны грамадска палітычнаму развіццю ў 1970 – першай палове 1980-х гг. [29]). Нягледзячы на некаторыя недахопы, ён каштоўны шырокім прыцягненнем разнастайных фактычных даных і імкненнем да навуковай аб’ектыўнасці. Што тычыцца паасобных праблем (напрыклад, вывучэння дысідэнцтва), гэта калектыўная манаграфія з’яўляецца вялікім крокам наперад для беларускай гістарычнай навукі – гаворка можа ісці пра пэўную легітымізацыю праблематыкі ў межах акадэмічнага дыскурсу.

Прадстаўнік беларускай дыяспары Я.Запруднік у працы “Беларусь на гістарычных скрыжаваннях”, пераважна прысвечанай гісторыі ХХ ст. (да 1992 г.) – беларускі пераклад выйшаў у серыі “Адкрытае грамадства”

ў 1996 г. [30], – паспрабаваў раскрыць тыя тэмы, якія беларускія гісторыкі, па вялікім рахунку, на той час яшчэ толькі пачыналі вывучаць. Праца сапраўды вылучаецца з агульнага корпусу даследаванняў беларускай гісторыі – не ў апошнюю чаргу вялікай колькасцю выкарыстаных крыніц, узважанасцю суджэнняў і неардынарнасцю поглядаў, хоць, безумоўна, пэўны ўплыў ідэалагічных установак аўтара (вядомага беларускага нацыяналіста) можа быць прасочаны. У манаграфіі шмат цікавых назіранняў, напрыклад, Я. Запруднік бадай адзіны даследчык, які спецыяльна падкрэсліў і вылучыў на першы план у падзеях 1986–1992гг. у Беларусі "канфлікт паміж нацыянальнай інтэлігенцыяй і камуністамі" [30, с. 133–135] і інш.

Неабходна адзначыць даволі цікавыя працы беларускага даследчыка Ю. Вашкевіча, які займаўся вывучэннем польска-беларускіх культурных сувязей у другой палове XX ст. У манаграфіі, прысвечанай дадзенай прабелеме, змешчаны варты ўвагі аналіз агульнай сітуацыі ў беларускай савецкай культуры [31, с. 55–74]; пазней гэты фрагмент у якасці эсэ быў передрукаваны ў перакладзе на нямецкую мову ў гадавіку "Annus Albaruthenicus" [32].

Гісторыя беларускага дысідэнцтва распрацоўвалася вельмі павольна. Паводле значнасці выдадзеных прац бясспрэчным лідарам у гэтай галіне з'яўляецца "Архіў найноўшай гісторыі" (на чале з А. Дзярновічам), які ў канцы 1990-х – сярэдзіне 2000-х гг. выдаў некалькі энцыклапедычных даведнікаў, прысвечаных беларускаму іншадумству [33, 34, 35, 36] – адзіныя такога кшталту выданні ў Беларусі, таму іх каштоўнасць наўрад ці магчыма пераацаніць. У межах гэтага ж праекта выдадзена два нумары часопіса «Шуфляда», прысвечанага беларускай гісторыі XX ст., дзе немалое месца займала гісторыя дысідэнцтва [37].

Варты ўвагі артыкул П. Мажэйкі, прысвечаны моладзеваму руху 1980-х гг. [38]. Для нашай тэмы найбольш важная выснова аўтара аб тым, што большасць удзельнікаў моладзевых суполак у Мінску напрацягу абазначага прамежку часу выйшлі з сем'яў тэхнічнай і перадусім творчай інтэлігенцыі [38, s. 202].

Паасобныя працы, у якіх узнятыя цікавыя ў сувязі з нашым даследаваннем праблемы, не выкарыстоўваліся, паколькі іх аўтары схіляюцца ў бок публіцыстыкі ці залішняга суб'ектывізму. З такіх у першую чаргу трэба адзначыць творы Ю. Весялкоўскага [39] і Г. Сіненкі [40]. Тым не менш, відавочна, яны таксама могуць служыць каштоўнай крыніцай інфармацыі.

Бадай што ўсім вышэйназваным работам уласцівы традыцыйны спосаб апісання гісторыі культуры ў Савецкім Саюзе (і прыватны

выпадак гэтай шырэйшай тэмы – гісторыі савецкай інтэлігенцыі). Яны зыходзяць з успрымання гэтай культуры як падзеленай на дзве антаганістычныя часткі. Калі ў рускай гуманітарыстыцы двума палюсамі гэтай апазіцыі зазвычай выступаюць дысідэнты і прадстаўнікі афіцыйнай культуры, то ў беларускай літаратуры, на думку В. Голубева, часцей артыкулюецца проціпастаўленне “нацыянальнай” і “савецкай” тэндэнцый [41]. Неабходна заўважыць, што такі спосаб стварэння вобразу савецкага мінулага ўласцівы многім нацыянальным гістарыяграфіям [42, с. 210]. Цалкам безуважнай беларуская гістарыяграфія засталася да новых падыходаў да праблемы, якія з’явіліся, напрыклад, у Расіі. Так, Н. Казлова выказала думку пра тое, што найбольш адэкватным сродкам апісання рэчаіснасці савецкай культуры з’яўляецца метафара гульні (маючы на ўвазе пры гэтым, перш за ўсё, сацыялагічныя даследаванні П. Бурдзье) [43, с. 198–199]. С. Ушакін прааналізаваў дакументы палітычнага самвыдату і зрабіў выснову, што яны не супрацьпастаўляліся савецкай уладзе, але, наадварот, прынцыпова наследвалі ёй, ажыццяўляючы перайманне ўласцівых ёй дыскурсаў і спосабаў выказвання (гэты наватарскі і вельмі цікавы артыкул выйшаў спачатку па-англійску [44] і потым быў перакладзены на рускую мову [45]).

Асаблівай увагі даследчыка ў сувязі з праблематыкай гісторыі інтэлігенцыі патрабуе ўдакладненне аб’екту. Справа ў тым, што многія разгледжаныя вышэй працы маюць характар аглядных работ, што часта прыводзіць даследаванне да павярхоўных, занадта абагуленых вынікаў. Зачаста вынікам навуковага даследавання з’яўляецца абстрактны вобраз савецкай культуры, пазбаўлены ўласна асоб, якія тады дзейнічалі, і падрабязнага разгляду мікрапрактык індустрыі культуры. Арыентацыя на індывідуальнае, непаўторнае, акцэнт на «гісторыі знізу» павінны зрабіцца ключавой характарыстыкай новых работ. На гэта ў літаратуры ўжо звярталася ўвага [5, с. 38].

Сярод важнейшых недахопаў, якія існуюць у сённяшнім стане распрацаванасці праблемы, трэба адзначыць бадай поўную адсутнасць даследаванняў, у якіх аналізаваліся б паасобныя крыніцы па праблеме. Напрыклад, прафесійная гістарыяграфія зусім праігнаравала немалы корпус крыніц, які складаюць разнастайныя дзённікі і мемуары дзеячаў беларускай савецкай культуры (М. Танка [46], М. Дубянецкага [47, 48, 49], В. Адамчыка [50, с. 3–146] і некаторых іншых). Дагэтуль няма грунтоўнага выдання зборніка дакументаў беларускага самвыдата[4], ніхто не займаецца вывучэннем багатай тэкставай спадчыны перыядычных выданняў і архіўных дакументаў.

Такім чынам, можна ўпэўнена канстатаваць, што беларуская гістарыяграфія яшчэ не пачала актыўнае вывучэнне праблемы дачыненняў паміж інтэлектуаламі і ўладай у БССР у 1980-х гг. (і ўвогуле – паваеннага часу). Тым не менш, паасобныя даследаванні, выкананыя на дастаткова высокім узроўні, ужо зроблены. Тэма ўяўляецца надзвычай перспектыўнай і актуальнай не толькі з выключна навуковых меркаванняў.

**Заўвагі:**

1. Як гэта фармулюецца, напрыклад, тут: "У прымяненні да сацыяльнай структуры савецкага грамадства часцей выкарыстоўваліся дакладнейшыя і палітычна нейтральныя тэрміны "кадры", "спецыялісты" і "службоўцы". Пры гэтым не ўлічваўся духоўны, этычны сэнс вызначэння, які захоўваўся ў штодзённым словаўжыванні" [5, с. 35].

Пар.: "Тут адстойваецца фармальная і каштоўнасна-нейтральная дэфініцыя паняцця, якая як катэгорыя навуковага аналізу зусім не залежыць ад інтэлектуальных самаапісанняў" [25].

2. Пра адметнасць падыходаў да пытання аб месцы і ролі інтэлектуалаў (інтэлігенцыі) у розных традыцыях пісаў Я. Грыцак [8, с. 61–63].

3. Загаловак гэтага артыкула вельмі паказальны адносна прадмету гаворкі ("Інтэлектуалы: абраза – дыскурсіўнае паняцце – надмагільны помнік?"). Д. Берынг паказвае ў сваім артыкуле, што самі па сабе гэтыя спрэчкі зыходзяць з "*фальшывай перспектывы"*, прадугледжваючы нязменную семантыку гэта слова, між тым як яна змяняецца ў залежнасці ад канкрэтных умоў эпохі [9, S. 5], што, як падаецца, апраўдвае прапанаваны тут падыход з працоўнымі мэтамі атаесаміць паняцці "інтэлігенцыі" і "інтэлектуалаў".

4. Асобна ў дадзенай сувязі трэба ўзгадаць сецевы рэсурс «Вытокі» [51], на якім змешчана немалая колькасць дакументаў неафіцыйнай культурнай прасторы БССР.

## Крыніцы і літаратура:


1. Дзярновіч, А. Зноў пра маштаб / А. Дзярновіч // Нонканфармізм у Беларусі: 1953–1985. Даведнік. Т. 1. – Мінск.: Athenaeum, 2004. – С. 6–22.
2. Беларускі авангард 1980-х [Выяўленчы матэрыял] / [уклад. А. А. Клінаў ; аўт. тэкста В. Архіпава ; пер. на англ. мову С. Соўсь]. – Мінск, 2011. – 131 с. : іл.
3. Ерофеев, В. Время «МетрОполя» / В. Ерофеев // Метрополь: Литературный альманах. – М.: Зебра Е; ЭКСМО-Пресс, 2001. – С. 5–15.
4. Дубавец, С. Майстроўня. Гісторыя аднаго цуду / С. Дубавец. – [Б. м.]: Радыё Свабодная Эўропа / Радыё Свабода, 2012. – 464 с.
5. Вирская, В.П. Интеллигенция Беларуси как исследовательская проблема: историографический аспект / В.П. Вирская // Образы прошлого в историографии: белорусско-французский диалог: Материалы междунар. науч.-практ. конф., Минск, 21–22 мая 2008 г. / Ред. кол.: А.Н. Алпеев и др. – Минск.: Веды, 2008. – С. 33–44.
6. Ле Гофф, Ж. Интеллектуалы в средние века / Ж. Ле Гоф. – СПб.: Изд. дом С.-Петерб. гос. ун-та, 2003. – 154 с.

7. Лаврухин, А. Незаконченное послесловие к интеллектуальным крохам / А. Лаврухин // Топос. – 2011. – №2. – С. 55–60.

8. Грыцак, Я. Гульні з качаргою: усур’ёз і па-ўкраінску / Я. Грыцак // ARCHE Пачатак. – 2004. – №1. – С. 54–68.

9. Bering, D. „Intellektueller“: Schimpfwort – Diskursbegriff – Grabmal? / D. Bering // Aus Politik und Zeitgeschichte. – 2010. – 4. Oktober. – S. 5–12.

10. Грамши, А. Тюремные тетради / А. Грамши. – В 3 ч. Ч. I. Пер. с ит. – М.: Политиздат, 1991. – 560 с.

11. Боббио, Н. Интеллектуалы и власть / Н. Боббио // Вопросы философии. – М., 1992. – № 8. – С. 162–171.

12. Фуко, М. Интеллектуалы и власть: Избранные политические статьи, выступления и интервью / М. Фуко. – М.: Праксис, 2002. – 384 с.

13. Фуко, М. Интеллектуалы и власть. Избранные политические статьи, выступления и интервью / М. Фуко. – Ч. 2. – М.: Праксис, 2005. – 320 с.

14. Ортега-и-Гассет, Х. Камень и небо / Х. Ортега-и-Гассет. – М.: Грант, 2000. – 295 с.

15. Мілаш, Ч. Скуты розум / Ч. Мілаш. – Мінск.-Вільня: Фрагмэнты-Віленскі клюб, 2000. – 248 с.

16. Антанович, Н.А. Интеллектуалы в системе социальных и властных отношений / Н.А. Антанович // Диалог культур – 2010: наука в обществе знания: сборник научных трудов международной научно-практической конференции. – СПб.: Изд-во Санкт-Петербургской академии управления и экономики, 2010. – С. 326–330.

17. Бригадина, О.В. Белорусская национальная культура 1930-х гг.: к постановке проблемы “художник и власть” / О.В. Бригадина // Працы гістарычнага факультэта БДУ: Навук. зб. Вып. 3. – Мінск: БДУ, 2008. – С. 80–85.

18. Яновский, О.А. Диалог интеллигенции и советской власти о сущностных характеристиках белорусского университете (начало 1920-х гг.) / О.А. Яновский // Працы гістарычнага факультэта БДУ: Навук. зб. Вып. 4. – Мінск : БДУ, 2009. – С. 76–86.

19. Усманова, А. Философия и позиция критического интеллектуала сегодня / А. Усманова // Топос. – 2005. – №1. – С. 40–62.

20. Шпарага, О. Политическая топография Беларуси: солидарность, сообщества, университет / О. Шпарага // Топос. – 2005. – №1. – С. 72–79.

21. Гапова, Е. Белорусские интеллектуалы: между классом и нацией? / Е. Гапова // 2005. – № 1. – С. 63–71.

22. Горных, А. Интеллигенция и эстетика антикоммунизма / А. Горных // Топос. – 2011. – №2. – С. 28–37.

23. Głogowska, H. Bialorus,1914–1929: Kultura pod presja polityki / H. Głogowska. – Bialystok: Białorus.T-wo Hist., 1996. – 238 s.

24. Дмитриев, А. Контекст и метод (предварительные соображения об одной становящейся исследовательской дисциплине) / А. Дмитриев // Новое литературное обозрение. – 2004. – №66. – С. 6–16.

25. Morat, D. Intellektuelle und Intellektuellengeschichte [Электронны рэсурс] / D. Morat. – Berlin, 2011. – Режым доступу: http://docupedia.de/zg/Intellektuelle_und_Intellektuellengeschichte. – Дата доступу: 25.10.2013.

26. Шартье, Р. Интеллектуальная история и история ментальностей: двойная переоценка? / Р. Шартье // Новое литературное обозрение. – 2004. – №66. – С. 17–47.

27. Шутова, О.М. Историография и постмодерн: вопрос об идентичности во второй половине XX – начале XXI века / О.М. Шутова. – Минск.: БГУ, 2008. – 277 с.
28. Нарыс гісторыі беларускай дзяржаўнасці: XX стагоддзе. – Мінск : Беларус. навука, 2008. – 615 с.
29. Навіцкі, У. Палітычны стан грамадства. Узмацненне фактараў крытычнасці і пратэсту / У. Навіцкі // Гісторыя Беларусі. У 6 т. Т. 6. Беларусь у 1946 – 2009 гг. – Мінск.: Современная школа, Экоперспектива, 2011. – С. 358–386.
30. Запруднік, Я. Беларусі на гістарычных скрыжаваннях / Я. Запруднік. – Мінск.: Беларускі фонд Сораса: ВЦ “Бацькаўшчына”, 1996. – 326 с.
31. Вашкевіч, Ю. Беларуска-польскія культурныя сувязі ў 1945 – 1991 гг. / Ю. Вашкевіч. – Мінск.: Тэсей, 2004. – 181 с.
32. Vaškevič, J. Sowjetische Kultur in Belarus / J. Vaškevič // Annus Albaruthenicus. – 2009. – Bd. X. – S. 7–24.
33. Пазацэнзурны перыядычны друк Беларусі (1971 – 1990) / Пад рэд. У. Арлова. – Мінск.: Архіў найноўшай гісторыі, 1998. – 172 с.
34. Ля вытокаў незалежнага грамадства. Асобы і падзеі беларускай апазіцыі 1950 – 1980-х / Пад. рэд. Л. Андросіка і А. Дзярновіча. – [Б.м.]: Архіў найноўшай гісторыі, 1998 – 15 с.
35. Дэмакратычная апазыцыя Беларусі: 1956–1991. Пэрсанажы і кантэкст. Даведнік / Пад рэд. А. Дзярновіча. – Мінск.: Архіў найноўшай гісторыі, 1999. – 186 с.
36. Нонканфармізм у Беларусі: 1953 – 1985. Даведнік. Т. 1. / Аўтар-укладальнік А. Дзярновіч. – Мінск.: Atheneum, 2004. – 252 с.
37. Шуфляда: часоп. найноўшае гісторыі: квартальнік / Заснав.: А.Дзярновіч. – Менск [Мінск]– 1999. – № 1; 2001. – № 2.
38. Мажэйка, П. Незалежніцкія памкненні беларускай моладзі ў сярэдзіне 1980-х гадоў / П. Мажэйка // Białoruskie Zeszyty Historyczne. – 2003. – Nr 19. – S. 196–211.
39. Весялкоўскі, Ю. Ад Гарбачова да Белавежы (1985–1991) / Ю. Весялкоўскі. – Беласток-Лёндан, 2004. – 287 с.
40. Сіненка, Г.Д. Насуперак канону: Да праблемы станаўлення творчай індывідуальнасці ў абставінах таталітарызму: Жыццёвы і творчы шлях А.А. Лойкі / Г.Д. Сіненка. – Мнінск : Бел. навука, 1997. – 428 с.
41. Голубев, В. Культура Беларуси в годы советской власти / В. Голубев // Філаматы. – 2003. – №4. – С. 69–86.
42. Ушакин, С. В поисках места между Сталины и Гитлером: о постколониальных историях социализма / С.В. Ушакин // Ab Imperio. – 2011. – №1. – С. 209–233.
43. Козлова, Н.Н. Согласие, или Общая игра / Н.Н. Козлова // Новое литературное обозрение. – 1999. – № 40. – С. 193 – 209.
44. Oushakine, S.A. The Terrifying Mimicry of Samizdat / S.A. Oushakine // Public Culture. – 2001. – Nr.2. – P. 191 – 214.
45. Ушакин, С. Ужасающая мимикрия самиздата [Электронный ресурс] / С. Ушакин. – М., 2012. – Режим доступа: http://gefter.ru/archive/6204, дата доступа: 24.10.2013.
46. Танк, М. Збор твораў. У 13 т. Т. 10. Дзённікі (1960–1994) / М. Танк. – Мінск.: Беларус. навука, 2010. – 919 с.

47. Дубянецкі, М. Злое вогнішча. Да гісторыі выдання аповесці В.Быкава “Мёртвым не баліць” / М. Дубянецкі // Полымя. – 1999. – № 2. – С. 160–191.

48. Дубянецкі, М. “Трэба рызыкаваць…” / М. Дубянецкі // Полымя. – 2001. – № 10 – 12; 2002. – № 1–4.

49. Дубянецкі, М. “Трэба рызыкаваць”. Дзёньнікавыя запісы 1985 – 1988 гадоў / М. Дубянецкі // Дзеяслоў. – 2008 – 2010. – № 37–48.

50. Адамчык, В. Развітальная аповесць: Аповесць, апавяданні, дзённікі. – Мінск.: Маст. літ., 1999. – 448 с.

51. Вытокі: грамадскі вэб-архіў [Электронны рэсурс]. – Мінск., 2011. – Рэжым доступу: http://vytoki.net. – Дата доступу: 29.01.2013.